# ПАСТАНОВА

## САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЕ ССР

### АБ ПАПЯРЭДНІМ ПРОЭКЦЕ ПЯЦІГАДОВАГА ПЭРСПЭКТЫЎНАГА ПЛЯНУ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даклад Дзяржаўнай Плянавай Камісіі прыняць да ведама.

2. У працягу сакавіка і красавіка месяцаў г. г. абгаварыць на пасяджэньнях Савету Народных Камісараў з пачатку паасобныя галіны пэрспэктыўнага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР, адміністрацыйныя пытаньні, гаспадарчыя (прамысловасьць і сельская гаспадарка) і культурныя пытаньні, а пасьля разгледзець пэрспэктыўны плян цалкам.

Кіраўніку Спраў СНК т. Марозу і Нам. Старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі т. Буніну скласьці календарны плян праходжаньня гэтых пытаньняў у СНК.

3. Запрапанаваць Кіраўніцтву Спраў СНК выдаць у тыднёвы тэрмін стэнаграму сёньняшняга пасяджэньня з далучэньнем да яе табліц і аб'ясняльнае запіскі Прэзыдыуму Дзяржаўнай Плянавай Камісіі.

Стэнаграму разаслаць народным камісарыятам і акруговым выканаўчым камітэтам БССР і запрапанаваць ім у тыднёвы тэрмін пад адказнасьць народных камісараў і старшынь акруговых выканаўчых камітэтаў абгаварыць у сябе на калегіях і прэзыдыумах пэрспэктыўны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР і зрабіць свае заўважаньні і папраўкі да проэкту Дзяржаўнай Плянавай Камісіі.

4. Даручыць ВРНГ і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі, па адшуканьні новых аб'ектаў, павялічыць асыгнаваньні на разьвіцьцё прамысловасьці БССР.

5. Камандыраваць на гэтым тыдні ў Маскву т.т. Карпа, Буніна, Пятровіча, Каплана і Бонч-Асмалоўскага з належнымі матар'яламі для таго, каб у Дзяржаўнай Плянавай Камісіі Саюзу ССР уключыць у агульнасаюзны пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі гэты папярэдні проэкт пэрспэктыўнага пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Старшыня Савету Народных
Камісараў БССР **Яз. Адамовіч.**

Кіраўнік Спраў Савету
Народных Камісараў БССР **М. Мароз.**

Сакратар Савету
Народных Камісараў БССР **Н. Угараў.**

10 сакавіка 1927 г.
г. Менск